Аляксандр РАДЗЬКОЎ

Слова пісьменніка

# РЭКТАРЫ: урыўкі з кнігі




17 лістапада 2003 года ад пасады рэктара БДУ быў вызвалены прафесар Казулін. Тым самым ён перастаў быць старшынёю Савета рэктараў. Рэктарам БДУ Указам Прэзідэнта быў прызначаны былы міністр адукацыі, выпускнік БДУ, прафесар В. І. Стражаў. Да гэтага часу, так склалася, рэктар БДУ аўтаматычна станавіўся і старшынёю Савета рэктараў. Гэта было лагічна: БДУ — галоўная ВНУ краіны! Але ў мяне была іншая прапанова. З ёю я і пайшоў да Прэзідэнта.

Дакладваю:

— У Стражава ў БДУ будзе шмат працы ўнутры ўніверсітэта. У мяне на пасаду старшыні Савета рэктараў ёсць іншая кандыдатура.

Прэзідэнт зацікаўлена пытаецца:

— І якая ж?

— Шымаў!

Аляксандр Рыгоравіч пасля нядоўгай паўзы гаворыць:

— А я згодны! Шымаў не падвядзе, я гэта ведаю!

Уладзімір Мікалаевіч узначальваў Савет рэктараў з 2003 да 2019 года. Мяняліся рэктары, міністры, а старшыня Савета рэктараў выконваў функцыі каардынатара кіраўнікоў ВНУ ў забеспячэнні якаснай працы і развіцці вышэйшай адукацыі ў краіне.

Як правіла, мы былі адзінымі ў падыходзе да вырашэння праблем, але часам і разыходзіліся. Шымаў быў загартаваны гаралам працы ва ўрадзе, там яму шматкратна даводзілася вытрымліваць пазіцыю, бо кожны міністр сцяной стаіць за выгадную для яго галіны эканоміку, а міністр эканомікі адказвае за эканамічны дабрабыт усёй краіны, што, у прыватнасці, ушчамляе многія жаданні галіновых кіраўнікоў. Напрыклад, бойкі за бюджэтнае фінансаванне на пасяджэннях Савета Міністраў заўсёды былі не на жарт. Калі я на іх ішоў, то прымушаў увесь апарат міністэрства рыхтаваць неабходныя абгрунтаванні і дакументы з гранічнай адказнасцю, рабіў заяву, што іду на вайну. Таму вопытны Шымаў і як рэктар у любых абставінах выкладаў сваю пазіцыю, нават калі яна ішла насуперак меркаванню міністра. Але, папершае, яна заўсёды была абгрунтаванай, на крайні выпадак з яго пункту гледжання, па-другое, ён заўзята не настойваў, лічыў, што канчатковае меркаванне за міністрам як за кіраўніком, і, па-трэцяе, пасля прыняцця рашэння добрасумленна яго выконваў, няхай яно і пярэчыла яго меркаванню. Мне ён гаварыў, што паважае таго кіраўніка, які дазваляе выказаць сваю пазіцыю, хаця б выказаць.

Эканамічны ўніверсітэт пры рэктары Шымаве стаў набіраць, паказаўся новымі фарбамі. Ён сам інтэнсіўна займаўся навуковай працай, пісаў вучэбныя дапаможнікі, кіраваў дактарантамі і аспірантамі, асабіста ўзначальваў спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый, удумліва прызначаў кадры. І грашыма ён распараджаўся ўзважана! Стараўся забяспечваць выкладчыкаў узроўневым заробкам, паслядоўна рамантаваў вучэбныя карпусы, інтэрнаты. Мне, у прыватнасці, падабалася ў яго ўніверсітэцкая сталовая: мала таго што там смачна і нядорага кармілі, яна была прасторная, і студэнты маглі за столікамі не толькі перакусіць, але і зручна размясціцца са сваімі ноўтбукамі, іх ніхто не выганяў! Думаю, рэктар Шымаў укараняў еўрапейскую ўніверсітэцкую культуру. Дарэчы, і шмат хто з замежнікаў з розных куткоў свету выбіраў для вучобы Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, а, напрыклад, з Сарбонаю быў заключаны дагавор аб супрацоўніцтве і выдачы выпускнікам двайных дыпломаў.

Наша эканамічная школа вядомая далёка за межамі краіны! І БДЭУ ў эканамічнай адукацыі краіны заняў сваё прыкметнае месца. Я гэта выразна зразумеў, калі аднойчы адказваў на пытанне віцэ-прэм'ера А. М. Касінца. Ён — доктар-хірург, доктар медыцынскіх навук, мы з ім былі знаёмы яшчэ як рэктары, Аляксандр Мікалаевіч — Віцебскага медыцынскага ўніверсітэта, а я — Магілёўскага ўніверсітэта. Пасля прызначэння віцэ-прэм'ерам ён захацеў атрымаць эканамічную адукацыю ў магістратуры і запытаўся мяне, дзе лепей гэта зрабіць. Я, не задумваючыся, адказаў, што ў БДУ больш вывучаюць эканамічную тэорыю, а ў БНТУ — эканоміку прадпрыемства, а рэальную эканоміку ва ўсіх яе праявах — у Шымава ў «наргасе».

Уладзімір Мікалаевіч быў надзвычай карысны ў вызначэнні балансаў бюджэтнага і платнага навучання, стварэнні парога дапушчальнасці развіцця бізнесу ў гэтай адукацыйнай сферы, розніцы платы за навучанне, даступнай нашым людзям. Кароткае адхіленне на гэтую тэму.

Калі праблему колькасці студэнтаў у краіне і квот платнага навучання я ўзняў у размове з Прэзідэнтам, Аляксандр Рыгоравіч задумліва сказаў:

— Як жа мы можам адмовіць чалавеку ў жаданні вучыцца, тым болей за свой кошт?! Няхай нават пасля ўніверсітэта ён будзе стаяць за станком, гэта ж будзе чалавек высокай культуры!

І ўсё ж пытанне колькасці студэнтаў па розных спецыяльнасцях хвалявала многіх. Шымава асабліва абурала практычнае клішэ пра лішак у нашай краіне юрыстаў і эканамістаў. Тое, што ў нас развіваецца рынкавая эканоміка, і, адпаведна, бізнес, прадпрымальніцтва патрабуюць для кожнай фірмы і фірмачкі менавіта гэтых спецыялістаў, мала каго хвалявала. Старшыня Нацыянальнага банка Пётр Пятровіч Пракаповіч быў цалкам на баку Шымава, адкрыта заяўляючы, што ў нашай краіне трыццаць банкаў, а павінна быць трыста. І там патрэбны ўсё тыя самыя эканамісты і юрысты.

Няпроста было знайсці і аптымальную колькасць падрыхтоўкі праграмістаў, спецыялістаў для ІТ-сферы. Пастаянна бударажыў гэтае пытанне дырэктар Парка высокіх тэхналогій В. В. Цэпкала. Ён стараўся пераканаць Прэзідэнта, што нам патрэбна ў дзесяць разоў павялічыць падрыхтоўку праграмістаў. Мы рыхтуем 6000, а трэба, з яго пункту гледжання, — 60 000.

Прэзідэнт патрабаваў ад мяне абгрунтаванняў. Мы з Шымавым падрыхтавалі дзве круглыя дыяграмы. На адной паказалі размеркаванне выпускнікоў сярэдніх школ па адукацыйных узроўнях: прафтэхвучылішчы, каледжы, вышэйшыя навучальныя ўстановы. На другой — размеркаванне студэнтаў ВНУ па спецыяльнасцях: інжынеры, аграномы, тэхнолагі, урачы, настаўнікі, вайскоўцы. Адкуль узяць студэнтаў для такога рэзкага павелічэння падрыхтоўкі праграмістаў? Нам жа ў краіне патрэбны і механізатары для сельскай гаспадаркі, і слесары для прамысловых прадпрыемстваў, і вадзіцелі, і касіры-гандляры, і медсёстры, і ўрачы, і інжынеры, і вайскоўцы. У час даклада Прэзідэнту, паказваючы гэтыя дыяграмы, я кажу, што ў тры разы павялічыць падрыхтоўку для ІТ-сферы нам дазваляюць нават сёння і матэрыяльная, і кадравая базы. Пры гэтым усім зразумела, што для Беларусі развіццё ІТ-сферы выгадна: яна не патрабуе прыродных рэсурсаў, імкліва развіваецца і прыкметна прыбытковая. У нас людзі з высокім інтэлектам, у гэтым кірунку прадукцыйна працуюць беларускія навуковыя школы, каманда праграмістаў БДУ — адна з найлепшых у свеце, а гомельскі школьнік Гена Караткевіч на міжнародных алімпіядах па інфарматыцы ўвогуле непераможны. Прэзідэнт, выслухаўшы ўсе гэтыя меркаванні, заўважае:

— Так, мы можам павялічыць падрыхтоўку такіх спецыялістаў і трэба гэта зрабіць. Але таксама трэба думаць, куды пасля іх уладкуем і за кошт каго павялічым прыём на гэтыя спецыяльнасці. Усё трэба ўзважыць і рабіць з розумам!

Да Шымава ва ўніверсітэт студэнты ішлі. Прахадны бал быў высокі нават для навучання на платнай аснове. Таму фінансавыя магчымасці ў яго былі. І распараджаўся ён імі мудра: заробак, абсталяванне, рамонты. Шымаў правільна працаваў з банкамі: уклады пад выгадныя працэнты, дэпазіты, валютныя рахункі, таму грошы ў яго заставаліся і на будаўніцтва. Рэктар задумаў спартыўны комплекс з гульнявой залаю, памяшканнямі для заняткаў сілавымі і гімнастычнымі відамі спорту, басейнам для плавання. Грошай на ўсё не хапала, і Уладзімір Мікалаевіч папрасіў бюджэтнае фінансаванне, пяцьдзясят на пяцьдзясят. Я пагадзіўся. Па-першае, Шымаў — чалавек, які трымае слова, за будоўляй будзе назіраць асабіста, па-другое, ва ўніверсітэце спорт аўтарытэтны, студэнты трапляюць у многія зборныя каманды краіны (чаго толькі вартая іх выпускніца Дар'я Домрачава), па-трэцяе, такі падыход да выкарыстання пазабюджэтных сродкаў — прыклад для многіх рэктараў, а галоўнае — як можа ўніверсітэт такога ўзроўню абысціся без належнага фізкультурнага блока? Па прапанове міністэрства будаўніцтва спартыўнага комплексу эканамічнага ўніверсітэта ўключылі Указам Прэзідэнта ў Інвестпраграму.

Шымаў заключыў з будаўнікамі адпаведную дамову і ўважліва сачыў за будаўніцтвам. Тыя ў вызначаныя тэрміны ўкладзіся, але прымаць аб'ект напрыканцы года рэктар катэгарычна адмовіўся: стаў працякаць басейн. Будаўнікі скрозь слёзы прасілі падпісаць акты пра гатоўнасць аб'екта да эксплуатацыі, іначай не выконваецца Указ Прэзідэнта і з гэтага вынікаюць меры дысцыплінарнага ўздзеяння. Выканаўцам інвестпраграмы было і міністэрства, таму я асабіста паехаў ва ўніверсітэт пераконваць Уладзіміра Мікалаевіча прыняць аб'ект у эксплуатацыю напрыканцы года. Будаўнікі абяцалі за тры месяцы ліквідаваць недапрацоўкі. Калі мы не пойдзем ім насустрач, то ўсе атрымаем пакаранне за невыкананне ўказа і пасля трэба будзе прасіць Прэзідэнта пра перанос уводу аб'екта на пайгода, увесь гэты час будаўнікі з крыўдай на нас будуць валакіцць будоўлю, і не факт, што канчаткова ліквідуюць на аб'екце ўсе недахопы. А калі пойдзем ім насустрач — яны будуць абавязаныя нам, пастараюцца адказаць нам дабром. Шымаў пагадзіўся пры ўмове, што даводку будоўлі мы будзем кантраляваць удвух.

Будаўнікі не падвялі! Ужо ў красавіку мы з кіраўніцтвам будаўнічага трэста № 7, прарабам, майстрамі і брыгадзірамі самым уважлівым чынам прымалі канчаткова завершаны спартыўны комплекс. Ён быў настолькі добры, што рэктар прапанаваў запрасіць на адкрыццё Прэзідэнта, паказаць яму, як можна канчаткова распараджацца грашовымі сродкамі ўніверсітэта і забяспечваць студэнтам арганізацыю здаровага ладу жыцця. Шымаў нават планаваў прапанаваць ахвотным платныя аздараўленчыя паслугі. Эканаміст у ім жыў заўсёды!

Пасля стараннага агляду спартыўнага комплексу мы з Уладзімірам Мікалаевічам вырашылі для будаўнікоў зрабіць прыём. Пры пераходзе ў будынак сталовай на фуршэт я ўбачыў чыстае зорнае неба і вырашыў паказаць усёй камандзе зімовыя сузор'і. Напоўніцу ззяў Арыён, акружаны Вялікімі і Малымі Сабакамі, Блізнятамі, Вознікам, Цяльцом. Зырка гарэлі Бетэльгейзэ, Сірыус, Капэла, Альдэбаран. Захапленне памерамі і далечынёю гэтых свяцціл змянялася трывогай чакання хуткага выбуху самай яскравай зоркі Арыёна. А яшчэ легенды пра сузор'і... Уявіце: сорак дарослых, самавітых мужчын зачаравана ўзіраюцца ў касмічную прыгажосць. Уладзімір Мікалаевіч ціха мне на вуха сказаў:

— Мы цяпер з гэтымі будаўнікамі можам узяцца за любы аб'ект.

Прэзідэнт даў згоду на наведванне ўніверсітэта, ён выказаў жаданне не толькі агледзець новы спартыўны комплекс, але і выступіць з лекцыяй пра сучаснае эканамічнае становішча краіны перад студэнтамі. Рэктар вырашыў паказаць сваю спартыўную базу ў дзеянні — басейн, усе памяшканні і трэнажорныя залы былі запоўнены, ішлі заняткі ў адпаведнасці з раскладам. У гульнявой зале супраць стаялі адна другой каманды валейбольных каманды. Раўнадушна прайсці міма іх не даваў напал сапраўднага спартыўнага боя. Каманды былі ўкамплектаваны добрымі спартсменамі, вылучаліся яркія лідары, гульцы ў спартыўным азарце не заўважалі высокіх гасцей. Уся дэлегацыя на чале з Прэзідэнтам застыла каля валейбольнай пляцоўкі. Было відавочна, што Аляксандр Рыгоравіч захапіўся спартыўным паядынкам, які разгарнуўся ў нас на вачах. Ён дачакаўся завяршэння партыі і падышоў да спартсменаў — з разуменнем справы яны захоплена пачалі абмяркоўваць самыя вострыя моманты гульні. Пасля гэтага Прэзідэнт завітаў да студэнтаў у аўдыторыю і з пад'ёмам прачытаў ім лекцыю аб праблемах сусветнай эканамічнай палітыкі, аб ступені яе ўплыву на развіццё нашай краіны, аб стратэгіі развіцця нацыянальнай эканомікі.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня; 9, 16, 23, 30 ліпеня, 13, 20, 27 жніўня.)*

*(Працяг будзе 10 верасня.)*